**Дарафей Фёнік**
**(Бельск Падляшскі)**

## Яраслаў Кастыцэвіч (1896-1971)

Яраслаў Кастыцэвіч з'яўляецца адной з найбольш значных асоб беларускага грамадскага і культурнага жыцця на Беласточчыне ў XX ст. Непамерна да гэтага знаходзіцца даследаванне ягонай біяграфіі. Мінулы час не спрыяў усебаковаму яе асвятленню. Сёння, па прычыне часовай адлегласці і смерці сведкаў, цяжка ўстанавіць ранейшыя факты з яго біяграфіі, затое перыяд асветнай дзейнасці можам прадставіць даволі добра на аснове ўспамінаў і пісьмовых крыніц.

Яраслаў Кастыцэвіч нарадзіўся 20 чэрвеня[1] (паводле іншых сведчанняў 6 чэрвеня) 1896 г. у сям'і настаяцеля праваслаўнага прыхода ў Пасынках а. Васіля Кастыцэвіча. Ягоная сям'я ад трох пакаленняў была звязана з гэтай вёскай на Бельшчыне. Прадзед Яраслава, а. Адам Кастыцэвіч запісаўся на старонкі гісторыі Царквы на Падляшшы як апошні уніяцкі святар і першы, пасля доўгага перапынку праваслаўны бельскі благачынны. Пасля а. Адама месца настаяцеля царквы ў Пасынках абняў яго сын, а. Андрэй Кастыцэвіч. У ягонай сям'і ў 1862 г. прыйшоў на свет сын, Васіль.

У хлапечыя гады Васіль Кастыцэвіч выявіў вялікія здольнасці да навукі. Пасля вучобы ў царкоўна-прыхадской школе хлопец быў адпраўлены ў гімназію, а затым у Варшаўскі універсітэт. Тут, на

1 20 чэрвеня гэта дата паводле юліянскага календара. Яе як дзень нараджэння *Я.* Кастыцэвіча даюць *Послужный Список* а. Васіля Кастыцэвіча ды некролаг з „Царкоўнага Весніка". Святлана Кастыцэвіч-Сычэўская сцвярджае, што дата гэтая няправільная, а яе бацька нарадзіўся 6 чэрвеня.

Гістарычна-філалагічным факультэце В. Кастыцэвіч працягваў вучобу да 1886 г., калі абараніў кандыдацкую дысертацыю. Год пазней, пасля высвячэння ў іерэі, вярнуўся ў Пасынкі, дзе ўспамагаў у духоўнай працы пажылога ўжо бацьку[2].

Сын а. Васіля, Яраслаў, як і яго старэйшыя браты Вячаслаў, Расціслаў і Андрэй нарадзіліся ўжо ў Пасынках[3]. На хроснага бацьку Яраслава Кастыцэвіча быў папрошаны а. Яраслаў Брэн са Старога Корніна, вядомы як аўтар працы пра рэлігійны побыт сялян Бельскага павета[4]. Свяшчэннікам быў таксама дзед Яраслава Кастыцэвіча па маці, Сафіі Келясцінаўне (з дому Будзіловіч).

Паходжанне продкаў, адукацыя бацькоў і асяроддзе, у якім жыў, фарміравалі характар малога Яраслава. Ён уважліва назіраў за працай бацькі, які з 1896 г. быў назначаны інспектарам царкоўна-прыхадскіх школ у павеце, а з 1901 г. выбраны быў членам Статыстычнага камітэта. У 1906 г. сям'я Кастыцэвічаў перабралася ў Трасцяніцу (цяпер Трасцянка), дзе год а. Васіль кіраваў тутэйшай царкоўна-настаўніцкай школай. У чэрвені 1907 г. Кастыцэвічы перасяляліся ў Бельск, у якім а. Васілій быў назначаны настаяцелем Троіцкага сабора. У тым жа або наступным годзе Я. Кастыцэвіч быў пасланы на вучобу ў Гродзенскую гімназію. З-за адсутнасці дакументаў, пра перыяд ягонай вучобы ў гімназіі не можам сказаць нічога канкрэтнага. Сваю адукацыю тут Я. Кастыцэвіч меў закончыць у 1914 г., аднак у сувязі з ваеннымі дзеяннямі ва Усходняй Прусіі гімназія ў Гродне была закрыта. Для завяршэння вучобы і атрымання атэстата сталасці Я. Кастыцэвіч перайшоў вучыцца ў гімназію ў Белай-Падляшскай[5].

Прадаўжаючы адукацыю, Я. Кастыцэвіч пайшоў па слядах брата Вячаслава і паступіў на юрыдычны факультэт Петраградскага універсітэта. У Петраградзе летам 1915г. дайшла да яго вестка пра эвакуацыю сям'і з Вельска ў Кіеў. У Кіеве а. В. Кастыцэвіч быў святаром 248-га палявога запаснога шпіталя[6].

Пасля некалькіх месяцаў, як студэнт, Я. Кастыцэвіч сустрэўся з сям'ёю ў Кіеве. Пасля мабілізацыі ў армію накіравалі яго ў гэты

2 Архіў Святланы Кастыцэвіч-Сычэўскай. *Послужный Список Настоятеля Св.-Троицкаго Собора Протоіерея Василгя Костыцевича,* 1914г. Адсюль узяты і іншыя звесткі пра а. Васіля Кастыцэвіча.

3 Расціслаў і Андрэй памерлі ў маленстве. Апрача іх Я. Кастыцэвіч меў двух малодшых братоў Ігара і Мсціслава.

4 *Особенности религиозного быта крестьян Бельскаго Уезда,* Вильно 1887 г. Бацька аўтара працы, а. Келясцін Брэн, напісаў таксама цікавае этнаграфічнае апісанне Бельскага павета.

5 Яраслаў Кастыцэвіч (некролаг) „Беларускі каляндар", 1972 г., с. 56-57.

6 ЗАГС у Вельску. Метрыкальная Кніга сабора Св. Тройцы ў Вельску 1914-1923. Запісы з гадоў 1915-1917 паходзяць са шпітальнай царквы.

горад на кароткую вучобу ў афіцэрскім вучылішчы[7]. Пасля абучэння Я. Кастыцэвіч атрымаў накіраванне на каўказскі фронт. Увосень 1917 г., разумеючы небяспеку, якую нясе з сабою балынавіцкая рэвалюцыя, Я. Кастыцэвіч дабіраецца ў Кіеў і разам з сям'ёю рашае вярнуцца ў Бельск. Увесну 1918 г. а. Васіль, назначаны бельскім благачынным, пачынае адбудову зруйнаванага ў перыяд бежанства царкоўнага жыцця.

У біяграфіі Я. Кастычэвіча перыяд першых гадоў пасля вяртання з бежанства вельмі няясны. Не можна сумнявацца, што жывучы ў Бельску ён цікавіўся тадышнім палітычным жыццём. Магчыма, што ў пачатку 1919 г. Я. Кастыцэвіч уступіў у арганізаваныя Міколам Дзямідавым вайсковыя часці Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэтыя атрады існавалі да пачатку 1920 г., калі вайскоўцаў абяззброілі, а іх камандзіра на некалькі месяцаў арыштавалі польскія ўлады. Пасля звальнення ўлетку 1920 г., пад кіраўніцтвам таго ж М. Дзямідава ўзнік беларускі батальён, ужо ў рамках арміі Станіслава Булак-Балаховіча. Ёсць сведчанні, што ў гэтым батальёне служыў штабс-капітан Кастыцэвіч, які 29 лістапада 1920 г. за праяўленую ў баі з бальшавікамі адвагу быў павышаны да звання падпалкоўніка. Дакладна аднак невядома, пра каторага сына а. Васіля тут гаворка, таму што ўсе яны былі афіцэрамі[8]. Вядомыя крыніцы не даюць нам імя таго афіцэра, таму пакуль няма падстаў сцвярджаць пра ўдзел Я. Кастыцэвіча ці нейкага яго брата ў апалчэнні М. Дзямідава.

У 1923 г. Я. Кастыцэвіч ажаніўся з Зінаідай Восіпаўнай Астасевіч. Спадарыня Зінаіда паходзіла з патомных мяшчан вуліцы Дубічы. Праз яе Я. Кастыцэвіч парадніўся таксама з Астасевічамі, уласнікамі маёнтка Шчыты-Дзенцялова.

Міжваенны перыяд у Польшчы для амбітных і адукаваных людзей няпольскага паходжання быў неспрыяльным. Магчымасць атрымання працы адпаведнай да адукацыі часта вязалася з парваннем са сваімі каранямі. Пры ацэнцы чалавека часта кіраваліся не яго адукацыяй і практычным падрыхтаваннем, а яго нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасцю. Такія каланіяльныя адносіны да чалавека адчуў на сабе і Я. Кастыцэвіч. Нягледзячы на адукаванасць, не ўдалося яму атрымаць працу на дзяржаўнай пасадзе, бо для іншаверцаў і людзей іншай нацыянальнасці не было месца[9].

7 „Беларускі каляндар", 1972 г., с. 56; „Церковный Вестник" н-р 11/1971, с. 16. У некралогах няма адназначнасці адносна віду вучылішча. У першым згадваецца, што гэта было артылерыйскае, у другім — конармейскае вучылішча.

8 А. Латышонак, *Дзень герояў,* „Ніва", н-р 48 ад 27.XI.1994 г.

9 Паводле інфармацыі Святланы Кастыцэвіч-Сычэўскай з Бельска (запісана 10.III.1995 г.).

Асноўнай крыніцай утрымання сям'і былі прыбыткі з арэнды дамоў, якіх у горадзе Кастыцэвічы мелі некалькі. Апрача таго даходы прыносіла зямля, якую абраблялі нанятыя работнікі. Кастыцэвічы стараліся жыць па найлепшых мяшчанскіх традыцыях. У шматпакаленневым доме бурліла кампанейскае жыццё.

У снежні 1930 г. памёр а. В. Кастыцэвіч. Сям'я і ўся праваслаўная грамадскасць Бельска развіталіся з адной з найболыд выдатных духоўных асоб у гісторыі Царквы ў Бельску. З яго адыходам закончылася святарская лінія роду Кастыцэвічаў.



Яраслаў Кастыцэвіч у час вучобы ў Кіеўскім ваенным вучылішчы.
Фота St. Eisfeld (з архіва Святланы Кастыцэвіч-Сычэўскай)

Уваход у Бельск савецкіх войскаў увосень 1939 г. сям'і Кастыцэвічаў прадвяшчаў нядобрае. Як уласнікі вялікай нерухомай маёмасці, глыбакаверуючыя і да таго сямейна павязаныя са святарамі, не змяшчаліся яны ў канонах „савецкіх грамадзян" і раней ці пазней былі б прызначаныя на ссылку, арышт ці нешта яшчэ горшае. Але спачатку новыя ўлады дазволілі Я. Кастыцэвічу ўладкавацца на працу настаўніка рускай мовы ў вечаровай школе ў Бельску[10]. У сакавіку 1941 г. быў ён ужо аднак арыштаваны савецкімі службамі бяспекі і перавезены ў турму ў Ломжы[11].

Сем'ямі Кастыцэвічаў і Астасевічаў Народныкамісарыят унутраных спраў цікавіўся раней. У 1940 г. была арыштавана і вывезена ў Казахстан сям'я Астасевічаў з двара ў Дзенцялове. Для хуткага арышту Я. Кастыцэвіча, відаць, не хапала „доказаў віны". „Дапамаглі" тутданосы бельскіх камуністаў[12].

У чэрвені 1941 г. прыйшла чарга на жонку і дачку Кастыцэвіча. 20 чэрвеня 1941 г. Зінаіда і Святлана Кастыцэвічы былі забраны з дому і адпраўлены ў Сібір. Канчатковай мэтай іх падарожжа быў Алтайскі край, дзе працавалі ў саўгасе[13].

10 Паводле інфармацыі Марыі Гушчын (з дому Антыховіч) з Бельска (запісана 9.IV.1995 г.).
11 Паводле інфармацыі Святланы Кастыцэвіч-Сычэўскай.
12 Там жа.
13 Паводле інфармацыі Святланы Кастыцэвіч-Сычэўскай.

Пасля заняцця горада немцамі 22 чэрвеня 1941 г. Я. Кастыцэвіч вярнуўся ў Бельск. Разлучаны з сям'ёй, самотны, Я. Кастыцэвіч у час нямецкай акупацыі адцаў сябе працы для дабра свайго народа. Спрыялі таму і адносіны да яго акупацыйных улад. Праз некалькі першых месяцаў выконваў ён абавязкі войта Бельскай гміны. Гэта паспрыяла весці старанні адкрыць школы. Захады прынеслі станоўчы плён. Ад верасня 1941 г. у гміне афіцыйна працавала ўжо нямала двухкласных школ з беларускай і польскай мовамі навучання. Існаванне гэтых школ не было б магчымае без дазволу павятовага камісара Тубенталя. Візітатарам школ быў назначаны Я. Кастыцэвіч, а пасля яго адыходу з гэтай пасады — Пятро Кісецкі[14].

Праца войта аднак не задавальняла амбіцый Я. Кастыцэвіча, таму што ён вельмі хацеў працаваць у школе. Усведамляў таксама тое, што вучоба ў праграмна абмежаваных афіцыйных школах не выхавае маладога чалавека ўсебакова. Аднак самай галоўнай прычынай таго, што Я. Кастыцэвіч у 1941 г. пачаў весці прыватнае навучанне ў сваёй хаце на Дубічах была адсутнасць беларускай школы ў Бельску. Існуючая тады польская школа не задавальняла патрабаванняў шмат якіх бацькоў-беларусаў, таму некаторыя вырашылі аддаваць дзяцей пад педагагічную апеку Я. Кастыцэвіча.

Болыпасць вучняў ягонай прыватнай школы была жыхарамі вуліцы Дубічы, на якой амаль у ста працэнтах пражывалі беларусы. Дзеці былі падзелены на класныя групы ад 1 па 5-7 чалавек і на дамоўленыя гадзіны прыходзілі на заняткі. Агулам вучылася прыблізна 40 дзяцей у сямі групах. У такіх умовах спосаб навучання быў практычна індывідуальны, што пры высокіх педагагічных талентах Я. Кастыцэвіча давала вялікі плён. Міхал Кардзюкевіч, тады яго вучань, успамінае: „Тое, што Яраслаў Кастыцэвіч мяне навучыў, памятаю да сёння"[15]. Паводле сведчанняў былых вучняў, навучанне вялося на расейскай мове (вядома, з бельскімі беларускімі асаблівасцямі, бо такой мовай Я. Кастыцэвіч карыстаўся штодзённа).

Прыватнае навучанне Я. Кастыцэвіча было нелегальнае і вельмі рызыкоўнае, пагражала арыштам. Нямецкія ўлады арыентаваліся, што ў доме войта гміны праводзіцца навучанне, аднак, відаць, не маглі знайсці „кароннага" аргумента, каб яго абвінаваціць. Паводле згаданага М. Кардзюкевіча, найчасцей немцы заходзілі зрання. Тадышні вучань, Анатоль Федаровіч, успамінае: „У Яраслава

14 J. Turonek, *Okupacyjna polityka szkolna w Okręgu Białostockim 1941-1944,* [w:] „Przegląd Historyczno-Oświatowy" 1976, nr 3, s. 310-333.

15 Паводле інфармацыі Міхала Кардзюкевіча з Бельска (запісана 20.III.1995 г.).

Кастыцэвіча арандаваў зямлю Мундэк Галэмбецкі і мы хадзілі да яго, быццам „работнікі", на ўсякі выпадак... Раз прыбылі жандары і Яраслаў Кастыцэвіч сказаў, каб мы выйшлі з дому. Мы хутка адправіліся ў памідоры Галэмбецкага і наеліся ўволю..."[16]

З пачаткам 1942/1943 навучальнага года частка вучняў Я. Кастыцэвіча пачала вучобу ў новаарганізаванай бельскай беларускай школе па вуліцы Гіндэнбурга (цяпер вул. Міцкевіча)[17]. У гэтай школе стаў вучыцца згаданы А. Федаровіч. Паводле яго, разам з узнікненнем школы Я. Кастыцэвіч спыніў прыватнае навучанне. Жыхарка вул. Дубічы Марыя Гушчын сцвярджае аднак, што ў дом Кастыцэвічаў надалей прыходзілі вучні, уключна да 1944 г. Пацвярджае гэта пісьмовы дакумент, пасведчанне ад 1946 г. пра тое, што „Я. Кастыцэвіч у гадах 1941-1944 вёў тайнае навучанне ў абсягу сярэдняе школы"[18]. Тадышняе навучанне мела відаць абмежаваны, індывідуальны характар. На жаль, не ўдалося пакуль устанавіць, хто ў ім удзельнічаў.

Увесь час акупацыі Я. Кастыцэвіч жыў у няўпэўненасці аб лёсе сваёй сям'і, якая надалей прабывала ў Сібіры. У 1943 г. іх лёс крыху памяняўся. У выніку перамоў Сталін — Сікорскі ў 1943 г. Зінаіда і Святлана Кастыцэвічы былі звольнены, але іх вяртанне на бацькаўшчыну не было магчымым у сувязі з ваеннымі дзеяннямі. Вярнуліся толькі праз два гады. Пасля доўгага падарожжа прыбылі яны ў Бельск тры дні пасля заканчэння II сусветнай вайны. 11 мая 1945 г. Я. Кастыцэвіч горача вітаў жонку і дачку ў родным горадзе.

У той час Я. Кастыцэвіч быў поўнасцю заангажаваны ў грамадскія справы Бельска. У жніўні 1944 г. стаў ён адным з членаў Гарадской рады нарадовай. Рада выбрала Я. Кастыцэвіча адным з двух намеснікаў бурмістра. Апрача таго быў Я. Кастыцэвіч прысяжным засядацелем (лаўнікам)[19].

Надалей галоўным зместам жыцця Я. Кастыцэвіча аставалася настаўніцкая праца. Быў ён адным з арганізатараў беларускай сярэдняй школы ў Бельску, у якой стаў намеснікам першага ды-

16 Успаміны Анатоля Федаровіча з Бельска (запісана 12.III.1995 г.).

17 Школа змяшчалася ў неіснуючым сёння драўляным будынку (дом Шварца). Дырэктарам быў Язэп Брыж, які навучаў беларускай мове. Школа была перапоўненая дзецьмі і моладдзю з Бельска і ваколіц. Хто там вучыўся, не меў абавязку адрабляць шарваркі і меў малыя шанцы быць забраным на работу ў Нямеччыну (паводле ўспамінаў Анатоля Федаровіча).

18 Архіў Беларускага ліцэя ў Бельску (далей АБЛ). Пасведчанне ад 31.VIII.1946г.

19 H. Kosieradzki, *Dzieje Bielska,* Bielsk Podlaski 1987, s. 305-306. *Я.* Кастыцэвіч быў адным з пяцёх беларусаў у Радзе з 21 чалавек. Цікава, што толькі адзін з іх не належаў да ППР.

рэктара — Анатоля Тымінскага[20] і адначасова выкладчыкам рускай і лацінскай моў. Хаця школа дзейнічала ў складаных матэрыяльных умовах (памяшканне і настаўнікі аплачваліся бацькамі вучняў), утрымлівалася дзякуючы адданасці Бацькоўскага камітэта. Немалаважная была тут роля віцэ-дырэктара Я. Кастыцэвіча. Ён як апякун Вучнёўскага камітэта наладжваў з вучнямі школныя мерапрыемствы, м. інш. ёлкі[21]. Быў таксама інспіратарам рэлігійнага жыцця вучняў. Урокі пачыналіся і канчаліся малітвай. У нядзелі і святы вучні арганізавана хадзілі на багаслужбы ў царкву. У храме часта спяваў школьны хор, кіраваны спадаром Я. Тарноўскім[22]. Яраслаў Кастыцэвіч быў таксама ў блізкіх адносінах з тадышнім праваслаўным прэфектам бельскіх школ, а. Канстанцінам Байко. Па-за школаю ўдзельнічаў ён у працах бельскага праваслаўнага Дэканальнага камітэта.

У другой палове 1945/1946 навучальнага года атмасфера вакол бельскай Беларускай дзяржаўнай гімназіі пачала згушчацца Некалькі разоў зрывалася шыльда школы, выбіваліся шыбы ў вокнах, сцены пэцкаліся непрыстойнымі надпісамі. У Міністэрства адукацыі пасылаліся даносы[23]. Відаць, гэтай цяжкай псіхалагічнай абстаноўкі не вытрымаў дырэктар гімназіі А. Тымінскі і, не дачакаўшы канца навучальнага года, перахаў у БССР. Рашэннем Беластоцкай куратарыі 16 чэрвеня 1946 г. часовае выконванне абавязкаў дырэктара было перададзена Я. Кастыцэвічу[24]. Школьны год закончыўся нармальна. Нічога не прадвяшчала закрыцця школы. Драматычная вестка прыйшла ў жніўні. Ні педагогі, ні бацькі не былі паінфармаваны аб прычынах такога рашэння.

Каб высветліць справу, Я. Кастыцэвіч разам з Міхалам Літвінчуком і Уладзімірам Місеюком (старшыня і адзін з членаў Бацькоўскага камітэта) падаліся ў Міністэрства адукацыі ў Варшаву. Толькі пасля настойлівых намаганняў бельскай дэлегацыі была паказана тоўстая папка даносаў і іншых актаў супраць школы. Міхал Літвінчук успамінае: „Нам тлумачылі, што наша школа з'яўляецца нібыта „зарывам прапаганды ідэі адарвання Беластоцкага ваяводства ад Польшчы", што з'яўляецца прычынай хвалявання сярод польскага насельніцтва, чаго ўрад „tolerować nie może"[25]. Як бачым, на прадаўжэнне дзейнасці школы не было ніякіх шанцаў.

20 З. Навіцкая, *Летапіс Беларускага Ліцэя,* „Białoruskie Zeszyty Historyczne", nr 2, s. 131-138.

21 АБЛ, Пратакол са сходу ёлачнай камісіі, 20.XII.1945 г.

22 Паводле інфармацыі Міхала Кардзюкевіча

23 АБЛ, Успаміны Міхала Літвінчука, спісаныя ўласнаручна 21.I.1972 г.

24 АБЛ, копія ліста Куратарыі Беластоцкай акругі ад 29.XI.1946 г.

25 Там жа.

З пачаткам новага навучальнага года Я. Кастыцэвіч часова застаўся без працы. Афіцыйнае адкліканне з абавязкаў дырэктара гімназіі прыйншо толькі ў канцы 1946 г.[26]. Не парваў, аднак, Я. Кастыцэвіч кантактаў са сваімі вучнямі, з якіх некаторыя перайшлі ў польскі Ліцэй імя Т. Касцюшкі. Тут Я. Кастыцэвіч выкладаў рускую і лацінскую мовы, а апрача таго навучаў у бельскай рамесніцкай школе.

У 1949 г., на хвалі аднаўлення беларускага школьніцтва на Беласточчыне, адрадзіліся беларускія ліцэй і пачатковая школа. На гэты раз іх адраджэнне было інспіравана зверху — з боку дзяржаўных улад. Таму часта пры арганізаванні школ праяўлялася паспешлівасць і няўлічванне патрабаванняў бацькоў[27]. Не апраўдаў патрабавання бацькоў, якія рашылі прысланць сваіх дзяцей у бельскі Беларускі ліцэй назначаны, відаць, адміністрацыйна, першы дырэктар спадар Скок. Міхал Літвінчук успамінае, што ён „не здолеў распалажыць да школы беларускае насельніцтва, пачатковая школа пуставала". На пачатку 1949/1950 навучальнага года бацькі звярнуліся да М. Літвінчука, як старшыні Бацькоўскага камітэта з просьбай: „Дайце нам дырэктара"[28]. У адказ ён адрэкамендаваў Я. Кастыцэвіча. Ягоная асоба была зацверджана ўладамі. Вядома, не без тармазоў. Сваім паходжаннем і мінулым не падыходзіў ён занадта да ўзору кіраўніка гадоў сталіншчыны. Камуністычныя дзеячы закідалі яму святарскае і кулацкае паходжанне. Да таго даходзіла яшчэ праца ў акупацыйнай адміністрацыі і беспартыйнасць[29].

Назначэнне Я. Кастыцэвіча дырэктарам беларускага ліцэя і пачатковай школы адкрыла новы этап у існаванні асветы ў Бельску. У школы пачало прыбываць усё больп вучняў. Каб прыцягнуць моладзь у ліцэй, Я. Кастыцэвіч выкарыстоўваў розныя нагоды, м. інш. асабіста накіроўваўся на царкоўныя святы ў розныя прыходы Бельшчыны, дзе зяўсёды знаходзіў новых кандыдатаў у ліцэісты.

26 Там жа.w

27 Ю. Туронак, *Беларускае школьніцтва на Беласточчыне ў пасляваенны перыяд,* Беласток 1976, сс. 10-14; пар. Ю. Туронак, *Становішча беларускага школьніцтва на Беласточчыне,* [w:] *Беларусіка = Albaruthenica,* т. 1, Мінск 1993, с. 82.

28 АБЛ, Успаміны М. Літвінчука

29 Я. Кастыцэвіч ведаў, хто яго выдаў савецкім уладам, аднак дараваў і не данёс немцам на тую асобу. Апрача таго, у 1941 г., у адказ на дэнунцыяцыі палякаў ён падпісаў заяву, што ўсе жыхары вуліцы Дубічы — лаяльныя новым уладам, хаця сярод іх было некалькі камуністаў. Быццам у адказ, пасля вайны жыхары гэтай вуліцы заявілі, што Я. Кастыцэвіч не супрацоўнічаў з немцамі, але служыў свайму народу і нават скрываў камуністаў. Паводле ўспамінаў А. Федаровіча.



Яраслаў Кастыцэвіч (другі злева) сярод настаўнікаў ліцэя.
Фота St. Eisfeld (з архіва Святланы Кастыцэвіч-Сычэўскай)

Беларуская школа знаходзілася тады ў будынку на вугле вул. Міцкевіча і Відаўскай ды дзяліла памяшканне з Пачатковай школай н-р 1[30]. Трэба было быць добрым дыпламатам, каб захаваць мірнае сужыццё двух рознанацыянальных школ. Пазней, праўда, на гэтым фоне ўзніклі канфлікты[31].

Першыя гады дырэктарства для Я. Кастыцэвіча былі перыядам напружанай працы. Гэта адмоўна адбілася на яго фізічнай кандыцыі. Цяжкой была, відаць, і псіхалагічная абстаноўка, у сувязі з апагеем сталіншчыны. 29 красавіка 1953 г. Я. Касгыцэвіч накіраваў у Аддзел асветы Ваяводскай рады нарадовай у Беластоку прашэнне аб звальненні з дырэктарскай пасады, таму што „pełnienie obowiązków dyrektora tak dużej szkoły jaką jest tutejsza wymaga wielkiego nakładu pracy, na który nie pozwala mój pogarszający się stan zdrowia"[32]. Праз месяц Аддзел асветы прыслаў адмоўны адказ[33]. Яраслаў Кастыцэвіч надалей быў дырэктарам школы. Прычыны такіх, здаецца, нечаканых адносін улад да ягонай асобы пакуль невядомыя.

30 На гэтым пляцы ў міжваенны перыяд было месца гандлю, т.зв. „свінскі рынак". Раней, да 1851 г. тут стаяла Троіцкая царква, у тым жа годзе перанесеная на могілкі.

31 Інфармацыя Арсенія Артысевіча з Бельска пра рэферэндум, які адбыўся ў школе наконт разлучэння беларускай школы з Пачатковай школай н-р 1 (запісана 9.IV. 1995 г.).

32 АБЛ. Прашэнне ў ВРН ад 29.IV. 1953 г.

33 Там жа, Ліст ВРН ад 30.V.1953 г.

У другой палове 50-х гадоў лік вучняў як беларускай пачатковай і сярэдняй школы, так і ПШ н-р 1 ставаўся ўсё большы. Умовы навучання сталі вельмі цяжкімі. Да таго дайшоў яшчэ пажар часткі будынка зімой 1956 г. У агні часткова загінула школьная дакументацыя. Яраслаў Кастыцэвіч разам з Бацькоўскім камітэтам пачаў старанні пабудаваць новы будынак для школы. Калі ў 1957 г. не здзяйсніліся спадзяванні на атрыманне будынка, у якім раней размяшчаліся Педагагічны ліцэй і Ліцэй выхавацельніц прадшколляў, пачаліся захады пабудаваць новае памяшканне.

Першай праблемай быў выбар месца. Першапачаткова ўлады прапанавалі пусты пляц у наваколлі сённяшняга малога рынку. Гэтую нявыгадную прапанову дырэктар рашуча адкінуў, схіляючы ўлады да прапановы сваёй і Бацькоўскага камітэта. Лічыў ён менавіта, што адзіным адпаведным месцам ёсць пляц у цэнтры горада, дзе да 1941 г. стаяла Мікалаеўская царква[34]. 1 верасня 1958 г. сабралася камісія бацькоў і настаўнікаў, каб зацвердзіць прапанову Я. Кастыцэвіча. Яму ж, разам з Канстанінам Майсенем, тадышнім старшынёй Павятовага аддзела БГКТ, было даручана старацца ў Аддзеле архітэктуры ВРН давесці справу да канца[35].

Прапанова была зацверджана ўладамі і ў наступным годзе пачаліся будаўнічыя працы. Дзякуючы настойлівасці Я. Кастыцэвіча і яго супрацоўнікаў, новы школьны будынак быў здадзены ў карыстанне ў пачатку 1961 г. Наконт выбару месца пад пабудову школы да сёння можна пачуць розныя меркаванні. Айцец Рыгор Сасна лічыць, што Яраслаў Кастыцэвіч аказаўся тут вялікім дыпламатам, абараняючы ў такі дастойны спосаб месца для праваслаўных беларусаў. „Закідаюць яму, што ён спрафанаваў месца, дзе былі пахаваны сотні і тысячы людзей (...), але нішто іншае тады не магло там стаяць: царква ці капліца"[36].

Добрыя ўмовы навучання ў новым будынку паспрыялі пашырэнню зацікаўлення вучобай у ліцэі. У шасцідзесятыя гады вучнямі школы і выхаванцамі Я. Кастыцэвіча было шмат сёння вядомых асоб.

У 1965 г., пасля рэарганізацыі бельскай беларускай школы і падзелу на дзве аддзельныя школьныя адзінкі, Я. Кастыцэвіч быў адпраўлены на пенсію. Аднак жа яшчэ да 1968 г. астаўся навучаць у ліцэі. Пасля канчатковага адыходу на пенсію ў 1970 г. да педагагічнага досведу Я. Кастыцэвіча звярнулася іерархія Праваслаўнай

34 Паводле інфармацыі а. Рыгора Сасны з Рыбалаў (запісана 28.III.1995 г.).
35 АБЛ, Protokół komisji wytypowania placu z dn. 1.IX.1958 r.
36 Інфармацыя а. Рыгора Сасны.

царквы ў Польшчы, прапануючы яму ўдзел у працах Мітрапалічнай камісіі па падрыхтоўцы і выхаванні царкоўных кадраў[37].

На пачатку 1971 г. *Я.* Кастыцэвіч захварэў. Хвароба аказалася смяротнай. Яраслаў Кастыцэвіч памёр 1 красавіка 1971 года. У пахаванні ўдзельнічалі сотні бяльшчан і больш дваццаці святароў. На пахаванне з Беластока прыбыў епіскап Ніканор[38]. Мітрапаліт Васілій прыслаў з Варшавы спецыяльную жалобную тэлеграму сям'і, у якой падкрэсліў „добрыя якасці Яраслава Васільевіча як педагога, сем'яніна і хрысціяніна (...)"[39]. Праводзіць пакойнага на могільнік выйшаў увесь Бельск. Над магілай прамовы сказалі дырэктар ліцэя Мікалай Гайдук ды а. Мікалай Сідорскі з Сувалкаў, адзін з выхаванцаў Яраслава Кастыцэвіча. Адыходзіў у вечнасць вялікі чалавек — адна з найбольш выдатных асоб у гісторыі Бельска і Падляшша.

***

Калі гэты матэрыял быў ужо падрыхтаваны да друку, на рукі аўтара нечакана трапілі ўспаміны **Людмілы Ермаковіч,** шматгадовай настаўніцы (у 1949-1954 гг. вучыла ў беларускай школе ў Бельску), цяпер на пенсіі. Асобе Яраслава Кастыцэвіча ва ўспамінах прысвечана шмат месца. Ніжэй прыводзіцца фрагмент гэтых успамінаў. Тэкст друкуецца згодна з арыгіналам.

Pan dyrektor Jarosław Kostycewicz był człowiekiem o żelaznym charakterze, ale żadnego ucznia nie pozwolił skrzywdzić. Wszyscy mieli przed nim respekt, ale jednocześnie nadzwyczaj go kochali i poważali. Całkowicie oddał się szkole. Nie było przerwy, na której nie chodził po korytarzu i nie nauczał młodzież dobrego zachowania się. Z ciemnych chłopskich dzieci zrobił zdyscyplinowaną młodzież; zorganizował chór i orkiestrę dętą. Wszystkie uroczystości i pochody uświetniała nasza orkiestra. Piękne instrumenty dęte i jednolite umundurowanie nadawały zespołowi rozgłosu.

Jarosław Kostycewicz uczestniczył we wszystkich próbach chóru i orkiestry. Znał każdego ucznia „od podszewki". Odwiedzał domy, wzywał rodziców, dyskutował, przekonywał. Jeżeli zaszła taka potrzeba, siadał na rower i jechał na wieś do rodziców. Zdarzało się, że jego stanowisko nie było dla nas zrozumiałe, ale swoją cierpliwością udawało mu się bronić uczniów. Pewnego razu trzy godziny dyskutowaliśmy na temat promocji pewnego ucznia z klasy 8 do 9. Groziły mu trzy dwójki, ale pochodził z odległej wsi i z bardzo ubogiej rodziny. Początkowo rada pedagogiczna miała żal do dyrektora, że wymusił promocję. Jednak po roku uczeń znacznie się poprawił, a obecnie jest inżynierem. Miał jednak rację „znawca dusz" Jarosław Kostycewicz.

37 а. Фёдар Такарэўскі, *Памяти Я. В. Костыцевича,* „Церковный Вестник", н-р 11/1971, с. 16.

38 Раней а. Мікалай Неслухоўскі, у 1948-1952 гадах служыў у Бельску, асабіста добра ведаў Я. Кастыцэвіча.

39 а. Фёдар Такарэўскі, там жа, с. 16.

Nic więc dziwnego, że w 1974 roku, na I Zjeździe Absolwentów, panowało ogólne oburzenie, że Liceum nie zostało nazwane jego imieniem. Zbudował przecież piękną szkołę z prawdziwego zdarzenia.

Wychowankowie pokazali miłość do dyrektora odprowadzając go na cmentarz. Była to manifestacja na wielką skalę. Kto tylko dowiedział się z prasy o śmierci, przyjechał do Bielska aby odprowadzić go na miejsce wiecznego spoczynku. Nie pozwolono aby go wieźli. Obsypanego kwiatami niesiono go 3 kilometry na rękach. Już nie uczniacy go nieśli, ale wysoko postawieni urzędnicy, którzy dzięki niemu zdobyli wykształcenie i wychowanie.

Trzeba wyjaśnić szerzej, jaki nastrój stworzył w szkole Pan Dyrektor. Zasadą jego było stworzyć młodzieży dobre warunki do nauki, życia towarzystkiego, zabawy i pożytecznego spędzania czasu. Namawiał radę pedagogiczną, aby wyrabiać w młodzieży pewność siebie, wyzbywać się niższości z powodu chłopskiego pochodzenia, umożliwić realizację marzeń. (...)

Pan Dyrektor nie zostawił żadnego absolwenta bez opieki. Jeździł na egzaminy wstępne na wyższe uczelnie, a w przypadku gdy komuś nie udało się zdać egzaminu, starał się znaleźć mu pracę. Prowadził rejestr swoich uczniów. Nic więc dziwnego, że kochali go wszyscy uczniowie i odwiedzali do ostatniej chwili.